# Аграном і ўладыка

## Напярэдадні Вялікадня на 79-м годзе завяршыў свой зямны шлях архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан



**Па благаславенні мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі сёння раніцай у пінскім саборы Уваскрэсення Славушчага Свята-Варварынскага жаночага манастыра пачнецца архірэйская Божая літургія. Пасля яе адбудзецца чын адпявання высокапраасвяшчэннейшага архіепіскапа. Дамавіну з яго целам перавязуць у жыровіцкі Успенскі сабор, дзе пройдзе задушная літыя. Пахаваюць архіепіскапа Сцяфана на тэрыторыі Свята-Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра.**

Светлыя сустрэчы з архіепіскапам Сцяфанам добра помняцца. Горды стан, прыветлівы погляд, прыгожая мова, вытрымка і мудрасць вызначалі яго. Мне неаднойчы даводзілася бываць на яго набажэнствах. Як велічна гучаў яго голас на святочнай урачыстасці ў храме Прарока Іллі, на малой радзіме мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, у палескай вёсцы Велямічы. Як цёпла сустракалі ўладыку мясцовыя вернікі. Ён знаходзіў час і магчымасць наведваць храмы ў самых аддаленых палескіх куточках. Да апошніх дзён зямнога жыцця шчыра

ступаць на раллю, каб не патаптаць усходаў. Пасля вучобы ў тэхнікуме Ігар Корзун размеркаваўся ў пастаўскі калгас «Рассвет». Кватараваў малады аграном у вясковай бабулі. На каталіцкія святы яна частавала юнака апетытнымі прысмакамі. Вечары бавіў за чытаннем кніг. У той час у краіне панаваў дзяржаўны атэізм. Душа маладога спецыяліста не ўспрымала таго, што мураваны будынак мясцовай праваслаўнай царквы пераўтварылі ў калгаснае сховішча. Сваё абурэнне гэтым фактам выказвалі тутэйшыя.

Побач з домам, дзе кватараваў малады аграном, жылі амаль стагадовыя вяскоўцы Фёдар і Сцяфан. Пазнаёміўся з імі і даведаўся, што ў іх ёсць старадаўнія кнігі пра жыццё святых старцаў. Зацікавіўся і доўгімі асеннімі вечарамі замест скокаў у сельскім клубе зачытваўся гэтай літаратурай. Як шчыра прызнаваўся ўладыка, чым больш гэтых кніг ён адольваў, тым мацней душа прагла святасці. У наваколлі не было праваслаўных храмаў. Толькі ў Паставах дзейнічала царква. Як выдавалася магчымасць, ездзіў у райцэнтр на богаслужэнні.

На маю цікавасць пра жаданне атрымаць вышэйшую агранамічную адукацыю суразмоўца філасофскі разважаў: працоўныя абавязкі выконваў бездакорна і атрымліваў добрыя заробкі, пра далейшую прафесійную адукацыю не

час дзякуючы стараннаму догляду колькасць жывёл на ферме значна павялічылася. Правяраючыя здзівіліся поспеху, за стараннне і выдатныя поспехі руплівы даглядчык атрымаў 20 дзён адпачынку. Самалётам адправіўся дамоў. Радаваліся такой нечаканасці маці і бабуля. Бацькі ўжо не было.

Дома салдат доўга не затрымаўся. Пераапрануўся ў цывільнае і паехаў у Мінск, у любімую царкву Аляксандра Неўскага, што на Ваенных могілках. А потым завітаў і ў Свята-Духаў кафедральны сабор. Душа маладога чалавека прагла веры...

І пасля службы ў арміі, працуючы ў чэрвеньскіх гаспадарках, усё больш адчуваў патрэбу духоўнага росту. Перачытаў шмат літаратуры, але адным гэтым наталіцца не мог. Выспявала жаданне прысвяціць сябе служэнню Богу. Сваім намерам падзяліўся з маці, тая яго поўнасцю падтрымала. Звольніўся і адправіўся ў Маскву, каб здаць дакументы для паступлення ў духоўную семінарыю. Калі вярнуўся дамоў, да яго ў вёску Карзуны прыехалі прадстаўнікі райкама

У журналісцкім блакноце занатавана: на маё параўнанне, што, як у пачатку мінулага стагоддзя малады Якуб Колас прыехаў настаўнічаць у палескую глыбінку, так і выпускніка духоўнай акадэміі лёс прывёў сюды, уладыка адказаў: «Мясціны цудоўныя, людзі шчырыя, адкрытыя, з Богам у сэрцы. Нават у часы фанатычнага атэізму на Заходнім Палессі ўцалела многа праваслаўных храмаў. Тут трывалыя карані моцнай веры, якую немагчыма знішчыць. Дзе вера, там і поспех у людзей. Даволі трывалыя гаспадаркі

Запала ў сэрца даўняя сустрэча з ім у старажытным Пінску. Цікава было слухаць расповед пра шлях да Бога сялянскага сына. Грамадзянскае прозвішча ўладыкі — Ігар Пятровіч Корзун. Доўгі час ён дасканала вывучаў карані свайго роду ў архіўных матэрыялах перапісу, які праводзіўся ў Расійскай імперыі ў мінулых стагоддзях. Продкі працавалі на зямлі.

Побач з яго роднай чэрвеньскай вёскай Карзуны ў неба ўпіраюцца крыжы мужчынскага манастыра ў Лядах. Бацькі трымалі гаспадарку, а дзяцей з малых гадоў прызвычайвалі да сялянскай працы. Дзяцінства будучага святара супала з цяжкім пасляваенным часам. Мірнае жыццё паступова наладжвалася. Аднавіліся заняткі ў вясковай пачатковай школе. У кожным класе было шмат пераросткаў, якім вайна перашкодзіла своечасова пачаць вучобу. На летніх канікулах з братам дапамагалі бацькам нарыхтоўваць сена, палоць агарод, упраўляцца па гаспадарцы. А ў вольны час юнак адводзіў душу за чытаннем. Яго краналі творы Якуба Коласа. Вельмі хваляваўся за вясковага Сцёпку з трылогіі «На ростанях» і яго будучыню.

Класічны твор прымусіў задумацца над сваім жыццёвым шляхам. Непадалёку ад роднай вёскі ў Смілавіцкім сельгастэхнікуме можна было атрымаць дыплом агранома. І сялянскі сын скарыстаўся гэтай магчымасцю. Праз два гады тэхнікум перапрафіліравалі, і давялося завяршаць вучобу па абранай спецыяльнасці ў Мар'інагорскім сельгастэхнікуме, які потым рэфармавалі ў агракаледж імя Уладзіміра Лабанка.

Практыкаваўся будучы спецыяліст сельскай гаспадаркі ў чэрвеньскім калгасе імя Дзяржынскага. Разам з галоўным аграномам падрыхтоўваў насенне да веснавой сяўбы, рэгуляваў сеялкі пад патрэбныя нормы высеву. Голас суразмоўцы ажываў, калі ён узгадваў пра першую самастойную сяўбу. Раніцай ляцеў у поле і з механізатарамі да цямна корпаўся каля зламаных агрэгатаў. А як чакаў першых парасткаў ярыны! Не адважваўся яшчэ былі працадні, а на Пастаўшчыне перайшлі на грашовую аплату. За месячны заробак калгасны спецыяліст мог купіць касцюм і туфлі.

*У пропаведзях уладыка падкрэсліваў, што праваслаўная царква — найдаражэйшая спадчына ад продкаў, і заклікаў беражліва захоўваць яе для нашчадкаў. Архіпастыр абвяшчаў: чалавек з Богам у сэрцы не пакрыўдзіць, не прынясе зла. Увогуле беларуская паства міралюбівая.*

Большую частку працоўнага дня ад сяўбы да ўборкі ўраджаю аграном праводзіў у полі. Пасля заканчэння палявых работ настаў час збірацца ў армію. Развітаўся з калектывам і паехаў да бацькоў на Чэрвеньшчыну, адкуль і пайшоў служыць. Тры гады аддаў армейскай службе ў войсках супрацьпаветранай абароны. Абслугоўваў ракетныя стартавыя разлікі. З-за высокага росту наваабранца прызначылі першым нумарам па ўстаноўцы ракет.

З гумарам узгадваў уладыка: калі начальнік штаба даведаўся, што сярод армейцаў ёсць выпускнік сельгастэхнікума, то даручыў яму падмяніць на свінаферме пры воінскай часці даглядчыкаў. З энтузіязмам салдат узяўся за даручаную справу. Праз нейкі партыі адгаворваць ад паступлення. Як ні стараліся, але пераканаць не змаглі. І потым, што ні рабілі, нічога не выходзіла. Нават выклікалі нарад міліцыі і завезлі ні ў чым не вінаватага маладога чалавека ў райаддзел, дзе некалькі гадзін трымалі. Уручылі і павестку на зборы. Маёр у ваенкамаце ўдакладніў, ці сапраўды затрыманы мае намер паступаць у духоўную семінарыю. Калі пачуў сцвярджальны адказ, прызнаўся, што было ўказанне адправіць яго на ваенныя зборы, забраў павестку і адпусціў яго. Кіраўнікі раёна не спыняліся: уладкавалі непакорнага агранома на працу ў гаспадарку. Але, як толькі прыйшоў выклік на экзамены, старшыня калгаса вымушаны быў адпусціць яго.

Уступныя экзамены прымала ўнушальная камісія. Пытанні задавалі складаныя. Дапамагла падрыхтоўка. Камісія прыняла рашэнне залічыць на вучобу. Аўдавелай маці шчаслівы сын паведаміў, што стаў семінарыстам. Паспяхова скончыў семінарыю і адразу падаў дакументы ў духоўную акадэмію. Датэрмінова прайшоў поўны курс навучання і са ступенню кандыдата багаслоўя атрымаў накіраванне ў Беларусь. Духоўную дзейнасць пачынаў святаром Свята-Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра. Потым стаў благачынным, быў намеснікам манастыра, узначальваў Беларускую духоўную семінарыю. Пасля дзесяці гадоў кіравання Пінскай епархіяй, у пачатку 2000-га, быў узведзены ў сан архіепіскапа.

Тры гады таму, калі архіепіскапу Сцяфану споўнілася 75, ён падаў прашэнне аб адлічэнні на спакой. Але Свяшчэнны Сінод благаславіў яго прадоўжыць кіраванне Пінскай епархіяй.

ў гэтым кутку Беларусі. Моладзь застаецца працаваць на зямлі. У палескіх вёсках захаваўся нацыянальны каларыт, традыцыі, звычаі. Дзе яшчэ можна знайсці такія вялікія вёскі, а цяпер і аграгарадкі, як вакол старажытнага Пінска? У святы мясцовыя храмы перапоўненыя. Сярод вернікаў шмат моладзі. Люблю наведваць вясковыя прыходы, сустракацца з прыхаджанамі, адчуваць іх шчырасць і адданасць праваслаўнай веры».

Архіепіскапа радавала духоўнае багацце палешукоў. Яго часта можна было бачыць у самых глыбінных куточках Палесся, дзе ён ладзіў богаслужэнні. Ён годна супраўджаў на тэрыторыі Пінскай епархіі мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Веніяміна. Ні адно свята-кірмаш «Дажынкі» на Брэстчыне не праходзіла без благаславення архіепіскапа Сцяфана. У 2014 годзе за ўклад у папулярызацыю духоўнасці і хрысціянскіх каштоўнасцей у грамадстве, а таксама дзеля ўмацавання аўтарытэта праваслаўнай царквы ў рэгіёне яму было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Брэсцкай вобласці». Па яго боскім благаславенні ў пачатку гэтай вясны палескія хлебаробы аднымі з першых у рэспубліцы выйшлі ў поле і паспяхова завяршылі сяўбу збожжавых і зернебабовых.

У пропаведзях уладыка падкрэсліваў, што праваслаўная царква — найдаражэйшая спадчына ад продкаў, і заклікаў беражліва захоўваць яе для нашчадкаў. Архіпастыр абвяшчаў: чалавек з Богам у сэрцы не пакрыўдзіць, не прынясе зла. Увогуле беларуская паства міралюбівая...

Вернікі з розных куткоў Беларусі сёння развітваюцца з архіпастырам Сцяфанам, праводзяць у апошні шлях адданага праваслаўнай веры і сваёй краіне беларуса.



**Уладзімір СУБАТ, «СГ»**
subbat50@mail.ru